# Наведалі «Белджы»

З экскурсіяй пры падтрымцы турыстычнага цэнтра Полацкага дзяржуніверсітэта выкладчыкі кафедры аўтамабільнага транспарту і студэнты механіка-тэхналагічнага факультэта наведалі СЗАТ «Белджы». На прадпрыемстве сёння плённа працуюць выпускнікі Полацкага дзяржуніверсітэта. Наведвальнікі змаглі ўбачыць работу робатызаваных зварачных комплексаў, пры дапамозе якіх выконваюцца розныя аперацыі.

Госці з ПДУ таксама ацанілі ўзровень тэхнічнага абсталявання вытворчасці і высокую якасць аўто. Наведвальнікі атрымалі адказы на пытанні, а таксама запрашэнні на практыку і працу на прадпрыемстве.

**Наталля ШАЛУТКЕВІЧ.**